Просто хорошая газета

Отдушина

12+

№47 (794) 20 ноября 2019 года

Выходит один раз в неделю | Основана 18 октября 2002 года | Издатель УП «Газета Слонимская» | ГАЗЕТА РЕКЛАМНАЯ ДЛЯ ДОСУГА

ФУТБОЛ 1-Я ЛИГА



Игровой момент



Голевой удар Ханени

ФК «Слоним 2017» крупно проиграл у себя дома

В субботу, 16 ноября, в последней домашней игре сезона 2019 года «Слоним 2017» проиграл гомельскому «Локомотиву» со счётом 0:5.

«Слоним 2017» — «Локомотив» Гомель — 0:5 (0:3)

ФК «Слоним 2017»: Сай, Хмельницкий (Усович, 62), Кириченко, Заборонько, Харланов (Чернодаров), Баль (Герасимчик, 78), Тишко, Спасюк, Владислав Берг, Журневич (Вильгельм Берг), Новик (Семёнов, 36).

Голы: Ханеня (2), Макушинский (12), Соловей (36, с пенальти), Козловский (49), Соловей (66).

Предупреждения: Харланов (25), Баль (60), Тишко (63)

Удаление: Сай (31).

События в матче развивались стремительно. На 2-й и 12-й минутах дважды отличились гости и повели в счёте — 2:0.

На 31-й минуте за срыв атаки в пределах штрафной был назначен пенальти и удалён вратарь хозяев Дмитрий Сай.

Место в воротах занял Артур Семёнов. К сожалению, ему не удалось отразить 11-метровый удар, который мастерски выполнил недавно выступавший за слонимчан Андрей Соловей.

В перерыве встречи Александр Захаренко и Сергей Черемисин — авторы книги об истории слонимского футбола — торжественно вручили по экземпляру своего издания в подарок футболистам-ветеранам.

Во втором тайме, играя в меньшинстве, ФК «Слоним 2017» пытался переломить ход встречи. Но гомельчане не только оставили свои ворота в неприкосновенности, но и сумели поразить чужие ещё дважды.

ПРОДОЛЖЕНИЕ НА С. 3 «ОТДУШИНЫ»



Александр Захаренко и Сергей Черемисин дарят свою книгу ветеранам слонимского футбола

Пазнай сябе на фота

Паважаныя чытачы! Пазнавайце на старых фотаздымках сябе, сваіх знаёмых і блізкіх і тэлефануйце нам: 8 (01562) 29-999, 8 (029) 133-04-21 у працоўныя дні з 9:30 да 17:30.Найбольш цікавыя расповеды пра герояў здымкаў будуць надрукаваны ў газеце, а іх аўтары атрымаюць запрашальныя квіткі на спектаклі Слонімскага драматычнага тэатра.



Армрэслінг па-слонімску

На здымак з архіва нашай чытачкі Святланы Рымашэўскай, надрукаваны ў мінулым нумары газеты, на жаль, ніхто не адгукнуўся. Тым не менш Святлана Рымашэўская, якая перадала яго ў рэдакцыю, атрымае запрашальны квіток на спектакль для дарослых Слонімскага драмтэатра «Нязваны госць», які пакажуць у нядзелю, 24 лістапада.

На гэты ж спектакль атрымаюць запрашальныя квіткі Ірына Вількоўская, Галіна Дземяшэвіч (Коўшук) і Ніна Манкевіч, якія раней адгукнуліся на здымак слонімскіх медработнікаў.

Нагадаем, што пачатак спектакля «Нязваны госць» у 17:00 у бліжэйшую нядзелю. Запрашальныя квіткі чытачы павінны забраць у рэдакцыі нашай газеты на Чырвонаармейскай, 41 у працоўны час да пятніцы ўключна.

Мікола КАНАНОВІЧ
ФОТА З АРХІВА «ГС»



Фота з архіва слонімчанкі Святланы Рымашэўскай

ФУТБОЛ 1-Я ЛИГА

ФК «Слоним 2017» крупно проиграл у себя дома

НАЧАЛО НА С. 1 «ОТДУШИНЫ»

По завершении поединка корреспондент «ГС» встретился и побеседовал с тренером гомельского «Локомотива» Алексеем Шубенком, который долгие годы был связан со слонимским футболом.


Алексей Шубенок

— Алексей Иванович, сезон почти завершён. Хотелось бы узнать Ваше мнение о выступлении слонимской команды не только в завершившемся матче, а и вообще в 2019 году.



— В принципе, по имеющимся возможностям в этом году слонимская команда отыграла хорошо.

К сегодняшней игре мы готовились серьёзно. Несмотря на проблемы с финансированием, трудности с составом и вынужденное омоложение команды, «Слоним 2017» всё-таки сумел отобрать очки у «Руха» и «Смолевичей».

Леонид Леонидович, тренер ФК «Слоним 2017», с имеющимися ресурсами создал хорошую команду. Пожелаю ему успехов.

— Хорошо. Как Вы можете оценить игру воспитанников слонимского футбола?

— Все играли с желанием победить, старались. По самоотдаче ни к кому претензий не может быть. Всю команду можно отметить. Просто на сегодняшний день мы сильнее.

— Оцените перспективы слонимской футбольной молодёжи.

— Я благодарен тренерскому штабу слонимчан за то, что они решительно начали вводить в состав молодёжь. Для молодых игроков, если они останутся, это будет ступенькой для дальнейшего развития. Дай бог, чтобы всё было хорошо.

— В заключение скажите пару слов слонимским болельщикам и команде.

— Мне, знаете, тяжело говорить. Ведь 23 года отдано Слониму и его футболу. Часть души и сердца осталась здесь. Что-то в футбольном плане для города сделано. Я очень благодарен всем, с кем работал. Болейте за команду и поддерживайте её.

Поздравляю всех с 50-летием слонимского футбола!


Сергей БУЗУН
ФОТО АВТОРА

Спецпраект «Капітал». Абарона працы

Колькі зарабляюць беларусы?

Калі маеце стабільную, але нізкааплатную працу і жадаеце мець больш, але не ведаеце як і не маеце веры, што нешта можна змяніць, то вы трапілі ў пастку беднасці.
Гэтая з'ява характэрная для людзей, рэгіёнаў і для Беларусі цалкам.
Сутнасць пасткі ў тым, што грошай бракуе на павышэнне кваліфікацыі, адукацыю, пошук лепшай працы, бо трэба забяспечыць сям'ю хаця б неабходным тут і цяпер. Даводзіцца пагаджацца на тое, што даюць. Аднак адсутнасць зменаў часцей за ўсё толькі пагаршае сітуацыю.

Летась за рысай беднасці былі 5,6% беларусаў. Калі ўлічваць, што ў мінулым годзе ў краіне жылі 9,477 млн. чалавек, то за рысай беднасці былі 530,7 тыс. чалавек: гэта цэлы горад памерам з Гомель.



На рукі: 270 рублёў


Юрый, слесар-рамонтнік, Глыбоцкі раён

Спадар Юрый жыве ў Глыбоцкім раёне. Працуе ў калгасе слесарам-рамонтнікам.

З прычыны маленькіх заробкаў, якія плацяць працаўнікам сельскай гаспадаркі, ужо звальняўся. Але высокааплатнай працы ў раёне гэтак і не знайшоў, таму вярнуўся. «Бруднымі» яму налічваюць 330 рублёў. Пасля вылічэння падаткаў на жыццё застаецца менш за 270 рублёў.

На рукі: 20 рублёў


Сяргей Асіпёнак, падсобны работнік, Мінскі раён

Сяргей Асіпёнак працуе падсобным работнікам на агракомплексе, які падпарадкоўваецца Смалявіцкай бройлернай птушкафабрыцы. Жыве ў вёсцы Мглё, што ў Мінскай вобласці. То бок у рэгіёне, дзе афіцыйна зарабляюць больш за 1000 рублёў.

Але ён не атрымлівае нават мінімалку. У адзін з месяцаў за 144 гадзіны працы Сяргею налічылі 307 рублёў. А на рукі ён атрымаў толькі 20 рублёў пасля падаткаў ды ўсіх спагнанняў. Бываюць месяцы, калі мужчына ўвогуле нічога не атрымлівае. Быў выпадак, калі ён застаўся вінны прадпрыемству 50 рублёў. Звольніцца Сяргей Асіпёнак не можа, бо ён абавязаная асоба. Пісаў у райвыканкам, прасіў, каб далі працу з большым заробкам. Але вакансіяў у раёне не знайшлося.

Заробкі медыкаў

У пачатку 2019 года ў Беларусі дактарам (людзям самай прэстыжнай прафесіі ў свеце) паднялі заробак.

Цяпер адмыслоўцы атрымліваюць 24% надбаўкі да акладу – на 4% больш, чым летась. Калі казаць пра грошы, заробак павялічыўся ад 12 да 33 рублёў. Мы параўнаем заробкі ў беларускай ахове здароўя з заробкамі медыкаў у іншых краінах.






Беларусь	Польшча	Літва	Германія
€ 3 687	€ 12 438	€ 14 492	€ 46 716
Сярэднегадавы заробак за 2018 год	Сярэднегадавы заробак за 2018 год	Сярэднегадавы заробак за 2018 год	дадзеныя па сярэднямесячным заробку за 1 квартал 2019 г.

* Дадзеныя Белстат, GUS, Lietuvos statisticos departamentas, Destatis

На рукі: 100 рублёў

Такія парушэнні, як заробак, ніжэйшы за мінімалку, ды эксплуатацыя работнікаў, — з'ява ў Беларусі не новая. З тае прычыны, што іншай працы ў вёсках няма, работнікі калгасаў выконваюць не толькі ўласныя абавязкі, але і працу тых, каго калгас вырашыў не наймаць.


Уладзімір Яўхута, жывёлагадоўца, Слонімскі раён

«100 рублёў, 120, 180 сама больш», — распавядае пра свае заробкі Уладзімір Яўхута.

Спадар Уладзімір працаваў жывёлагадоўцам на ферме ў вёсцы Вострава Слонімскага раёна. Даглядаў кароў: карміў і паіў жывёлу, выкідаў гной. Апроч сваіх абавязкаў, выконваў таксама і працу вартаўніка. Часам працаваць даводзілася без выходных.

«30 дзён, 30 начэй на працы. Па 300 гадзінаў. Больш за мінімалку не атрымліваў», — кажа мужчына.

У снежні ферму ў Востраве закрылі, а ўсіх працаўнікоў перавялі на іншую. Яна таксама ўваходзіць у склад сельскагаспадарчага прадпрыемства «Міжэвічы». Не знайшлося там месца толькі Уладзіміру Яўхуту — яго скарацілі.

Пасля скарачэння спадар Уладзімір працягнуў судзіцца з кіраўніцтвам калгаса. І спагнаў з наймальніка даплату за звыштэрміновыя работы і даплату да мінімальнага заробку.

«Устаноўлены мінімальны заробак, які на гэты момант складае больш за 300 рублёў. Натуральна, чалавек, які прапрацаваў поўны працоўны час і нават больш за тое, не павінен атрымліваць менш», — каментуе сітуацыю спадара Уладзіміра прадстаўнік прафсаюза РЭП Ігар Комлік.

Спецпраект «Капітал». Абарона працы

Барані свае правы

Што трэба ведаць, каб не зарабляць менш за мінімалку?



Не плаці з кішэні

Што трэба ведаць, калі ты матэрыяльна адказная асоба?

У Беларусі чалавек можа не толькі зарабляць, але яшчэ заставацца вінным працадаўцу.

Адна з «найдаражэйшых» прафесіяў у краіне – прадавец. Уладкаваўся на працу, паставіў подпіс у дамове, што ты матэрыяльна адказны, – і ўсё, чаго не далічыліся падчас інвентарызацыі, кіраўніцтва спагоніць з цябе. Сумы недастачы могуць быць большымі, чым заробак.



Незаконнае звальненне

Што рабіць, калі гоняць з працы, а ты не хочаш сыходзіць?

Летась, паводле афіцыйнай статыстыкі, наймальнікі з буйных і сярэдніх прадпрыемстваў краіны звольнілі прыблізна 700 тысяч чалавек.

Частка з іх былі звольненыя незаконна. Калі вы разумееце, што працадаўца несправядлівы ў дачыненні вас, можна звярнуцца па дапамогу ў незалежны прафсаюз і пайсці ў суд. І пажадана не адкладаць гэтай справы. Бо, згодна з беларускім законам, абскардзіць звальненне магчыма толькі цягам месяца



Калі звальненне лічыцца незаконным?

1. Дамова скасавана па ініцыятыве наймальніка з парушэннем умоваў калектыўнай дамовы, пагаднення, парадку і ўмоваў звальнення
2. Звальненне на падставе, не прадугледжанай заканадаўствам, або калі ў загадзе аб звальненні маецца спасылка на законную падставу, але рэальна яна адсутнічае
3. Дамова скасавана па ініцыятыве наймальніка ў выпадку ліквідацыі арганізацыі, спынення дзейнасці ІП з работнікамі
4. У перыяд часовай непрацаздольнасці, перабывання ў адпачынку, звальненне цяжарнай жанчыны ці жанчыны ў дэкрэтным адпачынку



Міхал Залескі, эканаміст, эксперт тэлепраграмы «Асабісты капітал»

Чаму адны рэгіёны бяднейшыя за іншыя і што рабіць, каб у бедным раёне жыць лепш!

Нават у савецкія часы працаёмістыя прадпрыемствы стараліся будаваць не ў буйных гарадах, а ў сярэдніх ды малых. Каб людзі ў рэгіёнах без работы не сядзелі. Але начальства цяпер дзікае, савецкую практыку размяшчэння вытворчых сілаў забылася. І еўрапейскай палітыцы падтрымання бяднейшых рэгіёнаў таксама не навучылася. Таму кожнаму чалавеку трэба самому пра сябе паклапаціцца. Не разлічвай толькі на зарплату з адной работы. Рабі тое, што ў цябе найлепей атрымліваецца, спрабуй сам знайсці пакупніка на свае паслугі. Гэта называецца бізнес.

Калі вы выконвалі больш працоўных абавязкаў, чым прадугледжвае кантракт, звяртайцеся ў суд і патрабуйце даплаты за выкананую працу. У якасці сведак могуць выступіць вашыя калегі. Па юрыдычную кансультацыю можна бясплатна звярнуцца да незалежнага прафсаюза РЭП праз тэлефон (8017) 342 46 51, а таксама папрасіць дапамогі ў судзе.

ТАА «Выдавецкі дом «Інтэкс-прэс»
УНП 200687896

МАТЭРЫЯЛЫ СПЕЦПРАЕКТА ПАДРЫХТАВАНЫЯ РЭДАКЦЫЯЙ ТЭЛЕПРАГРАМЫ «АСАБІСТЫ КАПІТАЛ» БЕЛСАТ ТБ



«Быть руководителем большого предприятия — огромная ответственность:

шесть тысяч человек зависят от работы Слонимского мясокомбината»

Интервью с генеральным директором ОАО «Слонимский мясокомбинат»



Сергей Скиба

Сегодня на прилавках магазинов представлен огромнейший ассортимент мясной продукции разных брендов во всех ценовых сегментах. Выстоять в жесткой конкуренции сложно, но, как показывают положительные примеры, если много трудиться, можно завоевать рынок и находиться в числе лидеров.

В канун Дня работника сельского хозяйства и перерабатывающей промышленности АПК корреспондент «ГС» встретилась с директором ОАО «Слонимский мясокомбинат» Сергеем Скибой, который поделился опытом успешной работы, а также рассказал, что позволяет выдержать конкуренцию и быть лидером мясоперерабатывающей отрасли.

— Сегодня быть лидером в мясной отрасли — задача непростая. Для реализации этих планов на нашем предприятии работает целая команда профессионалов. На предприятии трудится полторы тысячи человек плюс 139 человек работает в филиале «Павлово-Агро». Слонимский мясокомбинат входит в пятерку крупнейших мясопереработчиков страны, где на сегодняшний день ежемесячно производится порядка 1400 тонн колбасных изделий, 2500 тонн мяса, 300 тысяч условных банок консервной продукции в месяц, 250-300 тонн полуфабрикатов. Отличительная особенность нашего предприятия в том, что мы являемся предприятием полного цикла переработки. Максимально, что может выпускать мясоперерабатывающее предприятие, мы все производим, начиная от сырокопченой колбасы и заканчивая кормами для продуктивных животных: выпускаем добавки для кормления свиней.

— Сергей Леонович, сколько наименований продукции выпускает предприятие?

— Более трехсот наименований продукции производится на мясокомбинате.

— Куда экспортируется продукция мясокомбината?

— Большая часть продукции продается на внутреннем рынке. Это в основном готовая продукция. Также порядка 40% реализуем на экспорт, в основном мясо говядины и немного колбасных изделий и консервов, которые поставляем в Армению и Грузию. Мясо говядины экспортируем на рынки более десяти стран. Возобновили поставки говядины в Исламскую Республику Иран, Таджикистан, Узбекистан, углубили и расширили реализуемый ассортимент продукции в Казахстан, Вьетнам, Гонконг. Сейчас ведем переговоры на поставку продукции в Саудовскую Аравию.

На предприятии внедрено и функционирует множество систем менеджмента. С 2016 года наш мясокомбинат ежегодно подтверждает право маркировки продукции знаком «Халяль». В 2019 году предприятие получило сертификат на право маркировки знаком «Халяль» консервов из говядины. В планах расширение ассортимента продукции «Халяль». Ведь это безграничный высокодоходный рынок.

В 2018 году предприятие подтвердило соответствие требованиям международной системы управления безопасности пищевых продуктов — FSSC 22000. Немногие могут похвастаться наличием таких сертификатов, подтверждающих качество и безопасность продукции.

Помимо географии поставок, мы расширяем и ассортимент выпускаемой продукции. Если раньше мы продавали говядину в виде сырья мясом на кости, то на сегодняшний день выпускаем переработанную говядину в виде полуфабрикатов и мяса бескостного. А это добавленная стоимость, дополнительная прибыль и новые рабочие места. Основными покупателями говядины, произведенной на Слонимском мясокомбинате, являются мусульманские страны. Но мы не стоим на месте. Наше предприятие сейчас проходит аттестационный аудит на право поставок продукции в Китай.

— Откуда Ваше предприятие берет сырье?

— Нашей сырьевой зоной являются семь районов Гродненской области, из которых больше всех поставляют сырье Слонимский, Зельвенский, Новогрудский и Кореличский районы.

— Как удается выдержать жесткую конкуренцию?

— Конкуренция на рынке действительно жесткая. Чтобы конкурировать и успешно продавать свою продукцию, необходимо в первую очередь уделять внимание её качеству. Покупатель сейчас требовательный, стоит один раз ошибиться, во второй раз он не купит нашу продукцию. Поэтому в первую очередь — это качественное сырье и наша команда, которая выпускает продукцию. Наши цеха по производству готовой продукции работают шесть дней в неделю.

Также мы занимаемся и развитием собственной сырьевой зоны. В 2005 году к Слонимскому мясокомбинату был присоединен филиал «Павлово-Агро». В этом году сельскохозяйственные площади увеличены вдвое путем присоединения части хозяйства «Победитель». Планируем увеличить поголовье для собственного обеспечения сырьем.

— Какая средняя заработная плата на предприятии?

— Средняя заработная плата на мясокомбинате по итогам 10 месяцев 873,5 рублей.

— Сергей Леонович, на должность руководителя Вы назначены не так давно. Каково это — быть директором крупного предприятия?

— На мясокомбинате я начинал работу в 2003 году, прошел путь от рядового экономиста, затем работал на производстве технологом, главным технологом, заместителем генерального директора по производству, два года отработал в управляющей компании холдинга заместителем генерального директора, и так сложилась судьба, что пришлось вернуться на Слонимский мясокомбинат, где я работаю третий год генеральным директором.

Быть директором — это в первую очередь большая ответственность перед коллективом: на предприятии работает полторы тысячи человек, у каждого из них своя семья, это значит, что смело можно умножать на четыре. То есть шесть тысяч человек из Слонимского района зависят от работы мясокомбината.

> Это диверсификация экспорта. Мы на сто процентов ушли от российского рынка. Казалось, еще пару лет назад это был приоритетный рынок: мы думали, что без российского рынка мы просто не сможем существовать. На сегодняшний день мы постоянно увеличиваем объемы производства и вся продукция, которая производится, продается, перерабатывается все сырье, принимается скот.

— Какими своими достижениями Вы гордитесь?

— Это диверсификация экспорта. Мы на сто процентов ушли от российского рынка. Казалось, еще пару лет назад это был приоритетный рынок: мы думали, что без российского рынка мы просто не сможем существовать. На сегодняшний день мы постоянно увеличиваем объемы производства и вся продукция, которая производится, продается, перерабатывается все сырье, принимается скот. Вот этот успех я считаю значимой заслугой. Также мы увеличили глубину переработки, увеличили объемы готовой продукции колбасных изделий, полуфабрикатов и консервов. Уменьшили реализацию продукции в виде сырья, выпускаем больше готовой продукции.

— Какой у Вас любимый продукт из того многообразия, которое производится на мясокомбинате?


— Вся продукция любимая. Семья предпочитает вареную группу продукции, например колбасу «Докторская по-слонимски», которая производится по традиционным технологиям. Есть у нас традиционная советская колбаса «Московская» по ГОСТу, которую в Беларуси уже никто не производит, так как выпускается она по сложной технологии. Такую продукцию нерентабельно выпускать. Но мы линейку такой натуральной продукции производим на протяжении долгих лет. Хорошие у нас сырокопченые колбасы, которые пользуются спросом у покупателей.

В канун Дня работника сельского хозяйства хочу поздравить коллектив Слонимского мясокомбината, сельхозпроизводителей, наших поставщиков с профессиональным праздником. Желаю всем крепкого здоровья, благополучия и достатка в семьях, профессионального роста, мира, добра и удачи в вашей почетной и нужной работе.

Анна ВОЛОДАЩУК
anna@gs.by

НАВІНЫ КНІГАРНІ

Выйшлі з друку «Ветлівыя словы» слонімскага пісьменніка Аляксея Якімовіча



Новая кніга Аляксея Якімовіча

Гэтая кніжачка для дзяцей малодшага школьнага ўзросту выйшла ў Мінску ў выдавецтве «Народная асвета» тыражом 1000 экзэмпляраў.

18 казак у гэтай кніжачцы змясціліся на 37 старонках і вучаць маленькіх чытачоў ужываць ветлівыя словы нашай беларускай мовы. Кніга цікава аздоблена малюнкамі мастака Марыны Навіцкай.

— Гэтая кніга распаўсюджваецца выдавецтвам праз кнігарні і бібліятэкі. «Белкніга» ўжо ўзяла на рэалізацыю 200 асобнікаў. Калі раскупяцца, то возьме яшчэ. Адпускная цана кнігі ў выдавецтве каля 4 рублёў. Колькі яна каштуе ў краме, я пакуль і сам не ведаю, — распавёў у размове з карэспандэнтам «ГС» аўтар «Ветлівых словаў» Аляксей Якімовіч.

Мікола КАНАНОВІЧ

Отдушина
20 ноября 2019 года №47 (794)

Афиша

Слонимский драмтеатр

24 ноября, воскресенье

Спектакль для детей «Как паука с луга прогоняли», начало в 12.00, 4 руб.

Спектакль для взрослых «Незваный гость», начало в 17.00, 7 руб.

Слонимский центр культуры

21 ноября, четверг

Открытое заседание любительского объединения для пожилых людей «Надежда», начало в 12.00

22 ноября, пятница

Праздничное мероприятие, посвящённое Дню работников сельского хозяйства и перерабатывающей промышленности «Будзе хлеб — будзе і песня!», начало в 15.00

Кинозал

20 ноября, среда

12.00, 14.00 «Клара и волшебный дракон» 2D (Украина, 6+, мультфильм, 1.25)

16.00 «Доктор Сон» 2D (США, 18+, ужасы, 2.30)

18.30, 20.30 «Ангелы Чарли» 2D (США, 12+, комедия, приключения, 1.59)

21 ноября, четверг

12.00, 13.45 «Подкидыш» 2D (Россия, 6+, комедия, семейный, 1.34)

15.30 «Ангелы Чарли» 2D (США, 12+, комедия, приключения, 1.59)

17.30, 21.30 «Обратный отсчёт» 2D (США, 16+, ужасы, 1.30)

19.00 «Ford против Ferrari» 2D (США, 16+, боевик, 2.30)

22 ноября, пятница

19.00 «Обратный отсчёт» 2D (США, 16+, ужасы, 1.30)

20.30 «Обратный отсчёт» 2D (США, 16+, ужасы, 1.30)

23 ноября, суббота

12.00, 13.45 «Подкидыш» 2D (Россия, 6+, комедия, семейный, 1.34)

15.30 «Ангелы Чарли» 2D (США, 12+, комедия, приключения, 1.59)

17.30, 21.30 «Обратный отсчёт» 2D (США, 16+, ужасы, 1.30)

19.00 «Ford против Ferrari» 2D (США, 16+, боевик, 2.30)

24 ноября, воскресенье


12.00, 13.45 «Подкидыш» 2D (Россия, 6+, комедия, семейный, 1.34)

15.30 «Ангелы Чарли» 2D (США, 12+, комедия, приключения, 1.59)

17.30, 21.30 «Обратный отсчёт» 2D (США, 16+, ужасы, 1.30)

19.00 «Ford против Ferrari» 2D (США, 16+, боевик, 2.30)

Дзед і інтэрнэт



МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

— Каб табе, Міхась, скулу ў бок! І табе, Верка, таксама! — лаяўся дзед Антось Чаропка, седзячы ля акна гарадской кватэры. — Прыперлі мяне ў гэны Мінск, як усё адно д`яблу за пазуху засунулі! Вось дык сын, вось дык нявестачка! Ні людзей, ні дрэў, ні травы — нічагусенькі не бачу, вядома ж, на дзясятым паверсе. Машыны вунь нібы карабкі ад запалак туды-сюды сноўдаюцца, а людзі як мурашкі. Для вясковага чалавека гэта нейкае пекла дый годзе!

— Не бядуй, дзед, ты бліжэй да неба ўзабраўся, бо табе ж хутка назаўсёды туды перабірацца, — пажартаваў унук Сяргей.

— Не балбачы, няцямля, ты сапраўднай прычыны не ведаеш! — Міхась падцягнуў табурэтку бліжэй да акна і сеў побач з бацькам. — Мы ж, тата, прадалі ў вёсцы твой дом, каб далажыць да нашых грошай і купіць у Мінску кватэру, а то ўсё на прыватнай туліліся, шмат за яе плацілі.

— Не крыўдуйце, тата, прывыкнеце, гэта толькі напачатку ніякавата, — мовіла нявестка.

— Дзед, я цябе навучу інтэрнэтам карыстацца, — паабяцаў унук. — Я ж у дзясятым класе вучуся, то ведаю камп`ютар уздоўж і ўпоперак. Ды і на вуліцу можаш з`ехаць на ліфце. У парк схадзіць, на лаўчацы пасядзець, у кіно там...

— У парк, у кіно, — перадражніў Антось. — Падхалеру мне ўсё гэта, калі ў вёсцы быў сапраўдны рай, а тут чыста пекла, ніводнага чалавечка не ведаю.

— Заўтра, як прыйду са школы і зраблю ўрокі, буду цябе прыбліжаць да інтэрнэта. Не можа быць, каб нічога не цяміў у гэтай справе. Ты ж не такі стары яшчэ, шэсцьдзесят пяць гадоў маеш. Праз інтэрнэт табе адкрыецца цэлы свет. Навучу заходзіць на сайт знаёмстваў, кабету пекную сабе знойдзеш. Іх тут як жаб на балоце. І зажывеш цікава і весела, — паабяцаў унук.

— Каму я патрэбен, — засумняваўся дзед. — Пекныя кабеты ў такіх кавалерах, як я, не маюць патрэбы. Ім каб маладога ды багатага.

Антось і не спадзяваўся, што так хутка пасябруе з інтэрнэтам, так зацікавіцца ім. І Сяргей пахваліў за здольнасці, тым самым прыдаў дзеду яшчэ большага натхнення.

На сайце знаёмстваў, куды заходзіў без унукавай дапамогі, яму вельмі спадабалася. Людзей там — як у выхадны дзень на кірмашы. А найбольш кабет. І маладых, і пажылых. Антось нават заганарыўся, што ён адзін з іхніх Забэцькаў такі, як унук кажа, прасунуты.

— Трэба пазнаёміцца з якой бабай, — цвёрда вырашыў. — Калі ўжо мне прыйшлося тут кукаваць да скону дзён, то не сядзець жа як сава ў дупле, пазіраючы з верхатуры на людскі мурашнік. Як баба трапіцца даспадобы, то можам і ў кіно схадзіць, і ў тэатр, бо не аднаму ж туды сунуцца.

У Антося проста вочы разбягаліся, ніяк не мог выбраць адну-адзінюткую, бо навошта яму гарэм? Трэба, каб была не маладая, але і не старая, нібы які почарапак. Каб маладзейшая за яго, але не нашмат.

Нарэшце выбраў. На здымку была з прыгожай прычоскай, у сіняй сукенцы, якая ёй вельмі пасавала, з такімі ж сінімі караламі на таўставатай шыі.

— Не надта каб прыгажуня, але ж і я не Ален Дэлон, — дзед быў самакрытычны. — Калі згодзіцца на сустрэчу, то будзе някепска.

Ён спісаў з манітора нумар тэлефона і на другі дзень пазваніў.

— Калі вы, дамачка, не супраць, то мы маглі б сустрэцца, — сказаў пасля прывітання. — Убачыў вашу фотку на сайце знаёмстваў і ўпадабаў...

Марыэта, так звалі кабету, ахвотна адгукнулася на прапанову сустрэцца. Толькі спытала, чаму Антось не выклаў на сайце знаёмстваў сваю фотакартку.

— А навошта? Сустрэнемся, тады і ўбачыце, які я ёсць.

— А можа вы мне не спадабаецеся?

— Авохці! Не спадабаюся! Вы, дамачка, ужо не ў тым узросце, каб перабіраць.

— Я зараз пакрыўджуся!

— Ды крыўдзіцеся колькі ўлезе, бо такога цвету па ўсяму свету, а мужчын, якія хацелі б пазнаёміцца, і не вельмі каб... Так што давайце не будзем траціць час, бо яго ў нас няшмат. Як кажуць у народзе, не на кірмаш едзем, а з кірмашу.

Дамовіліся сустрэцца на плошчы ля знака, дзе напісана адлегласць да ўсіх раённых цэнтраў.

Дзень выдаўся гарачы, і таму Антось надзеў сарочку з кароткімі рукавамі і завязаў гальштук.

— Дарэмна ты, дзед, гэту пятлю начапіў, — катэгарычна сказаў унук, які быў у курсе ягоных спраў.

— Так інтэлігентна!

— Не смяшы мяне! Гэта якраз і выдае тваё пралетарскае паходжанне, бо ў такую гарачыню ніхто гальштука не носіць. А зрэшты, як сабе хочаш. Ты ж ідзеш пакараць дамскае сэрца, а не я.

Пайшоў у гальштуку, бо што ўнук разумее? Хіба варта слухаць чалавека, які ходзіць у дзіравых джынсах нібыта бомж? І ён яшчэ будзе павучаць!

Ля знака сталі нейкія маладыя людзі і гаварылі на замежнай мове. На якой — Антось не разумеў, бо не ведаў ніводнай. Неўзабаве кампанія пайшла, і ён застаўся адзін.

«Тырчу тут як ялавец пры дарозе! — падумаў са скрухай. — А яна, можа, стаіць непадалёку ды насміхаецца».

Прайшло некалькі хвілін, і да яго наблізілася Маня Кабачок з суседняй вёскі Ляскі.

— Во, Маня, а ты чаго тут? — здзівіўся.

— Нейкі стары пень назначыў мне спатканне, ды, відаць, забыўся. У старых жа гэдак...

— А ты з сайта знаёмстваў? Марыэта?

— Ну... Адкуль ведаеш?

— Дык гэта ж я назначыў. Але скажы, чаму ты Марыэта? І фотакартку чужую ўперла...

— Ды ўнучка ўперла чужую, бо гэна баба маладзейшая. І Марыэту ўнучка прыдумала. Я ж цяпер у іх жыву. Унучка кажа, што гэта за імя — Маня? Так на цябе ніхто не клюне. Іншая справа — Марыэта!..

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

За главного редактора Николай Николаевич Кононович

Учредитель
Виктор Владимирович ВОЛОДАЩУК

ГАЗЕТА ВЫХОДИТ
НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

Телефоны редакции:
Velcom: 8-029-133-04-21
факс: 8 (01562) 2-90-00
звонить с 9.00 до 18.00
Skype — gazslon

Для корреспонденции:
231799, г. Слоним,
ул. Красноармейская, д.41
Юридический адрес:
г. Слоним, ул. Красноармейская, 41

Регистрационное удостоверение №65 от 05.03.2009 года выдано Министерством информации Республики Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

Авторы опубликованных материалов отвечают лично за подбор и достоверность фактов, их точка зрения может не совпадать с мнением редакции. Редакция не ведет переписки с читателями и оставляет за собой право не рецензировать и не возвращать рукописи. Редакция не несёт ответственности за содержание рекламы.

Свободная цена

Тираж номера 3010 экз.

Время подписания
к печати по графику
19 ноября 2019 года 17:00

РЕКЛАМНАЯ СЛУЖБА
8(044) 715-90-03
8(044) 762-48-39; 8(044) 715-90-03
ул. Красноармейская, 41
e-mail: gs@gs.by, gazslon@gmail.com

Объем — два условных печатных листа.
Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4.
индекс 230025
ЛП №02330/39 от 27.03.2014
Заказ № 5239

Распространяется с газетой "Газета Слонимская" по подписке и в розницу по Республике Беларусь

ISSN 1991-3362



